9. РГИА. – Фонд 733. – Оп. 62. – Д. 83. О предложении Римско-католической духовной коллегии учредить в Полоцке духовную семинарию. 15.11.1806–10.02.1807 г.
10. РГИА. – Фонд 823. – Оп. 3. – Д. 1364. Дело о состоянии Полоцкой епархиальной семинарии. 1820 г.
11. *Свидерский, Л.* Иоанн Красовский, Полоцкий униатский архиепископ / Л. Свидерский. – Витебск: Губерн. тип., 1911. – 437 с.
12. *Семашко, И.* Записки Иосифа, митрополита Литовского, изданные Императорской Академией наук по завещанию автора: [в 3 т.] / И. Семашко. – СПб.: Тип. Имп. Акад. наук, 1883. – Т. 1. – 746 с.
13. *Семашко, И.* Записки Иосифа, митрополита Литовского, изданные Императорской Академией наук по завещанию автора: [в 3 т.] / И. Семашко. – СПб.: Тип. Имп. Акад. наук, 1883. – Т. 2. – 786 с.

**(Дата подачи: 19.02.2016 г.)**

*С. В. Мяньчэня*
Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт, Мінск
*S. V. Menchenja*
Belarusian State Agrarian Technical University, Minsk

**УДК 94(476)”18/19”(=411.16)+351.761.1(476)(091)”18/19”**

# ЯЎРЭЙСКАЕ НАСЕЛЬНІЦТВА БЕЛАРУСІ Ў СВЯТЛЕ ДАКУМЕНТАЎ КАМІТЭТАЎ ПАПЯЧЫЦЕЛЬСТВА АБ НАРОДНАЙ ЦВЯРОЗАСЦІ (1897–1914 ГГ.)

# THE JEWISH POPULATION OF BELARUS ACCORDING TO THE DOCUMENTS OF THE COMMITTEE OF PEOPLE'S SOBRIETY (1897–1914)

*Артыкул прысвечаны адлюстраванню вобраза яўрэйскага насельніцтва Беларусі ў дакументах камітэтаў папячыцельства аб народнай цвярозасці (1897–1914 гг.). Аўтар разглядае ўдзел яўрэяў у ажыццяўленні дзяржаўнай палітыкі па барацьбе з народным п’янствам, а таксама іх ролю ў арганізацыі тайных корчмаў і нелегальным распаўсюджванні алкаголю.*
*Ключавыя словы: папячыцельства аб народнай цвярозасці; таемныя корчмы; яўрэі; нелегальны продаж алкаголю.*

*The article is devoted to the reflection of the image of the Jewish population of Belarus in the the documents of the committees of people's sobriety (1897-1914). The author considers the participation of Jews in the realisation of state policies to get rid of people's drinking, and their role in the organization of secret taverns and illegal distribution of alcohol.*
*Key words: committee of the people’s sobriety; the secret taverns; Jews; illegal sale of alcohol.*

Пытанне аб датычнасці яўрэйскага насельніцтва да распаўсюджвання звычкі спажывання алкаголю сярод славян мае глыбокія карані. Але калі ў цэнтральнай частцы Расійскай імперыі яўрэі стала не пражывалі, і дадзены тэзіс можна б было аднесці да міфалогіі, то на тэрыторыі былой Рэчы

Паспалітай, дзе яўрэі складалі значны працэнт насельніцтва, падставы для яго ўзнікнення былі. Так, сенатар Гаўрыіл Дзяржавін пасля інспекцыі тэрыторыі Беларусі ў 1800 г. выдае «Мнение об отвращении в Белоруссии голода и устройстве быта евреев», дзе пазначае: «Къ вящшему жъ ихъ разстройству не токмо въ каждомъ селеніи, но въ иныхъ и по нѣскольку построено владѣльцами корчемъ, гдѣ для ихъ и арендаторскихъ жидовскихъ прибытковъ продается по днямъ и по ночамъ вино. Сіи корчмы ничто иное суть, какъ сильный соблазнъ для простого народа. Въ нихъ крестьяне развращаютъ свои нравы, дѣлаются гуляками и нерадѣтельными къ работамъ. Тамъ выманиваютъ у нихъ Жиды не токмо насущный хлѣбъ, но и въ землѣ посѣянный, хлѣбопашенныя орудія, имущество, время, здоровье и самую жизнь» [1, с. 233]. Менавіта корчмы і яўрэі-карчмары вызначаюцца ім як адна з галоўных прычын беднасці мясцовага насельніцтва.

Увёўшы ў 1894 г. дзяржаўную «вінную» манаполію, урад абвесціў аб намеры паклапаціцца аб народнай цвярозасці, у сувязі з чым былі створаны адпаведныя папячыцельствы. Аднак мэта іх была не цвярозасць у выглядзе адмовы ад алкаголю, а падтрымка ідэі «культурнага», памеранага спажывання, арганізацыя культурна-асветніцкай дзейнасці, стварэнне народных чайных і народных дамоў, нагляд за продажам алкагольных напояў. У 1897 г. вінная манаполія распаўсюджваецца на тэрыторыю заходніх губерняў – Віленскую, Віцебскую, Гродзенскую, Магілёўскую, Мінскую і Смаленскую. Новая сістэма вызначала сваё стаўленне да яўрэйскага насельніцтва словамі аднаго з кіраўнікоў Люцынскага павятовага камітэта папячыцельства аб народнай цвярозасці Віцебскай губерні князя Мікалая Мяшчэрскага: «Галоўнае зло заключаецца не столькі ў злоўжыванні спіртнымі напоямі з боку насельніцтва, колькі ад піцейных устаноў прынятага тыпу з яго яўрэем-сядзельцам або карчмаром, мэта якога заключаецца ў зпаіванні наведвальніка да самазабыцця» [2, арк. 2].

«Яўрэйская энцыклапедыя Бракгаўза-Ефрона» (1908–1913) паведамляе, што ліквідацыя корчмаў і ўвядзенне «віннай» манаполіі ў канцы XIX ст. прывялі да таго, што звыш 100 тыс. яўрэяў пазбавіліся заробкаў [3]. Як жа ўпісалася яўрэйскае насельніцтва ў новыя ўмовы жыцця? Даць адказ на гэта пытанне дапамогуць дакументы папячыцельстваў аб народнай цвярозасці. Сярод іх можна выдзеліць наступныя групы:

• выданні папячыцельстваў, справаздачы губернскіх і павятовых камітэтаў і афіцыйная перапіска з іншымі ведамствамі, дзе пазначана афіцыйная пазіцыя дзяржаўных органаў;

• карэспандэнцыя членаў папячыцельстваў і звароты да камітэтаў, дзе бачна пазіцыя грамадскасці па дадзенаму пытанню.

Аб фарміраванні папячыцельствамі негатыўнага вобраза яўрэя як галоўнай прычыны п’янства сведчыць вышэй прыведзенае выказванне князя Мяшчэрскага. Вобраз яўрэя-шынкара паўстае і ў беларускамоўным выданні Пецярбургскага камітэта папячыцельства аб народнай цвярозасці

«Слова аб праклятай гарэлцы і аб жыцці і смерці п’яніцы» (1900), якое выйшла ў выглядзе ананімнай гутаркі, але, па некаторых дадзеных, можна з упэўненасцю назваць яго аўтарам беларускага краязнаўца і гісторыка Аляксандра Ельскага (1834–1916). Выданне складалася з дзвюх частак: «шчырая праўда» – гістарычны экскурс аб з’яўленні і распаўсюджванні гарэлкі, палітыцы дзяржаўнай манаполіі і шкодзе п’янства; «казка» – верш аб жыцці і смерці п’яніцы. У вершаванай частцы знаходзім наступныя радкі:

*Усе чужыя жонкі вясіолы і рэзвы,*
*А яго у смутку, бо мужык ня трэзвы.*
*Яна у клапоцці каля гаспадаркі,*
*А іон толькі жыду спаражняе чаркі.*
*...Людзі спаць лажацца натрудзіўшы косьці,*
*А іон бяжыць к Шмуйлу, папіваць, у госці* [4, с. 5–6].

Справаздачы папячыцельстваў аб народнай цвярозасці паведамляюць, што яўрэйскае насельніцтва, якое пад уздзеяннем фактараў рэлігійнага і сацыяльнага характару амаль не спажывала гарэлку, актыўнага ўдзелу ў працы камітэтаў не прыняло. Растлумачыць гэта можна як незадаволенасцю яўрэямі вынікам рэформы, так і неразуменнем тэсіза аб «культурным» спажыванні гарэлкі, з-за чаго не лічыліся яўрэі і мэтавай аўдыторыяй папячыцельстваў. Магілёўскі губернскі камітэт канстатаваў, што адносіны яўрэяў да рэформы вагаюцца ад нейтральных да негатыўных, аднак адкрытых выступленняў не назіраецца [5, с. 20]. Тым не менш адзінкавыя асобы ўсё ж уключыліся ў працу камітэта. Членам Віцебскага павятовага камітэта з’яўляўся купец Моўша Бяссмертны, які здаў у арэнду папячыцельству памяшканне гандлёвых крамаў на Смаленскім базары ў Віцебску. Аднак гэтым яго ўдзел у працы камітэта і абмяжоўваўся, ды і назваць яго прыхільнікам цвярозасці складана, бо адной з крыніц яго даходу да ўвядзення манаполіі было прадпрыемства па вырабу гатункавых гарэлак [6]. А вось у Лепелі яўрэйская грамадскасць на чале з загадчыкам Лепельскага яўрэйскага вучылішча Мордухам Баруховічам пазітыўна ацаніла дзейнасць папячыцельства і прыняла ўдзел ў яго працы [7, арк. 45].

Не разглядалася яўрэйскае насельніцтва і ў якасці мэтавай аўдыторыі папячыцельстваў аб народнай цвярозасці. Член Савета па справах казённага продажу піцей Міністэрства фінансаў Шумахер пасля камандзіроўкі па Віцебскай губерні ў 1900 г. вызначаў складанасць працы ў дадзенай мясцовасці ў тым, што «ў мяжы яўрэйскай аселасці гарадское насельніцтва пераважна складаецца з яўрэяў, якія не злоўжываюць у большасці выпадкаў моцнымі напоямі» [8, арк. 119 адв.]. Паведамляючы аб справаздачы Шумахера, віцебскі губернатар у лісце да павятовых камітэтаў асабіста ад сябе дадаў: «…развіваць сваю дзейнасць больш у сяленнях, а не ў гарадах і мястэчках, галоўны кантынгент насельніцтва якіх складаюць яўрэі» [8, арк. 122]. У справаздачы Віцебскага павятовага камітэта за 1903 г. пазначалася, што народныя спектаклі, арганізаваныя камітэтам, наведваюцца

толькі гарадской публікай (чыноўнікамі і яўрэямі), простага народу ў тэатры не заўважалась. У сувязі з чым спектаклі былі адменены [9, арк. 5].

Нягледзячы на такую сітуацыю, супрацоўніцтва з яўрэйскім насельніцтвам было непазбежна, калі гэта датычылася маёмасных пытанняў і справы арэнды памяшканняў для народных чайных. Пераважная большасць домаўладальнікаў сумленна ставілася да ўмоў арэнды, але катэгарычна не жадала ісці на зніжэнне аплаты. Цікавая сітуацыя ўзнікла вакол чайнай № 1 на Шклоўскім рынку ў Магілёве, пры якой існавала начлежка. Начлежка карысталася дурной славай, а яе асноўны кантынгент складалі мясцовыя бяздомныя, воры і п'яніцы, сяляне з-за пагрозы жыццю і маёмасці імкнуліся не набліжацца да яе [10, с. 126]. Каб павысіць прыбытковасць, камітэт прымае рашэнне аб ліквідацыі начлежкі. Уладальнік дома Іофэ ў адказ выказаўся, што ў такім выпадку ён адмаўляецца трымаць у сваім доме чайную, але калі начлежка будзе захавана, то ён гатовы знізіць арэндную плату з 800 да 450 руб. у год. Аб тым, чым так цікавіла домаўладальніка гэта неблаганадзейная ўстанова, застаецца толькі здагадвацца. Але камітэт, у сваю чаргу, зусім адмовіўся ад начлежнага дома і чайнай і перадаў іх разам з маёмасцю гарадскім уладам [10, с. 127].

Калі ў 1910 г. паўстала пытанне аб закрыцці чайнай № 1 у Мінску, у камітэт паступіла прапанова не прадаваць маёмасць чайнай, а перадаць Мінскаму дабрачыннаму таварыству, бо «на грамадскіх таргах удзельнічаюць у асноўным яўрэі, якія, уваходзячы ў змову, зaніжаюць цану да мінімуму» [11, арк. 63].

Значная частка інфармацыі аб яўрэях у дакументах папячыцельстваў аб народнай цвярозасці датычыцца іх удзелу ў нелегальным продажы алкаголю, які ажыццяўляўся ў самых разнастайных формах.

Так, Віцебскі губернскі камітэт неаднаразова звяртаў увагу на прыватныя яўрэйскія чайныя, якія адчыняліся былымі ўладальнікамі вінных крамаў. Тут прадаваўся чай самых горшых гатункаў, правілы паводзін былі самыя вольныя і дазвалялася распіваць прынесеныя з сабой гарэлку і віно, а часам і купляць іх на месцы [12, арк. 35]. Нягледзячы на відавочнае парушэнне заканадаўства, акцызныя чыноўнікі так і не здолелі ліквідаваць дадзеныя чайныя з прычыны асцярожнасці ўладальнікаў і наведвальнікаў.

Рэжыцкі павятовы камітэт (Віцебская губерня) паведамляў, што «сярод яўрэйскага насельніцтва, як гарадскога, так і сельскага, знайшлося нямала прадпрыімчавых асоб, якія заняліся вырабам спірта з палітуры, ездзяць па вёсках і прапаноўваюць свае паслугі тым, у каго хутка вяселле, ці іншыя ўрачыстасці» [13, арк. 27адв].

У в. Рубяжэвічы Мінскага павета па данясенні ўчастковага папячыцеля вольны час у святочныя дні быў арганізаваны наступным чынам: «Яўрэі выносяць на вуліцу самавары і ажыццяўляюць гандаль чаем … але большасць грамадзян знаходзяць прытулак у яўрэйскіх дамах, дзе праводзяць

час некаторыя за чаем, а больш за спіртнымі напоямі, чаму яўрэі стараюцца спрыяць, здабываючы свае выгады» [14, арк. 1].

Але часцей за ўсё быў арганізаваны перапродаж гарэлкі з казённых крам – «манаполек». Памер такога промыслу і яго прыбытковасць можна ўявіць з паведамлення з мястэчка Івянец: «Кожным амаль яўрэем-домаўладальнікам, якіх у мястэчку Івянец шмат, набіраецца ў казённай краме вялікая колькасць гарэлкі, якая ў кожную пару дня і ночы прадаецца імі. І ўсё гэта робіцца беспакарана, так што яўрэі, што гандлююць гарэлкай, кажуць, што ім у дні Саламона не было так добра, як у цяперашні час» [15, арк. 18]. Верагодна, мясцовы папячыцель занадта драматызуе сітуацыю, але фактам застаецца тое, што ў выніку ўвядзення манаполіі нелегальны продаж гарэлкі і колькасць таемных корчмаў і прытонаў значна ўзрасла. Аднак нягледзячы на рост нелегальнага продажу, затрымаць прадаўцоў было дастаткова цяжка, і не ўсе члены камітэта жадалі займацца гэтымі справамі, асцерагаючыся за свае адносіны з суседзямі і пагроз з боку абвінавачаных. Пакупнікі, са свайго боку, не жадалі выдаваць людзей, якія прадавалі ім алкаголь, каб не пазбавіцца кропкі, дзе можна было знайсці гарэлку ў любы час. Не спрыялі выкрыццю і бюракратызм, і пасіўнасць дзяржаўных устаноў.

Здараліся нават выпадкі падману і запалохвання насельніцтва. У адрас рэдакцыі «Вестника Финансов, Промышленности и Торговли» з мястэчка Свіслач Мінскай губерні быў дасланы ліст аб ходзе правядзення рэформы: «На месцах арганізаваны і прыватны выраб гарэлкі, але вінаватых не знайшлі, толькі апараты… Просты люд на першых парах аднёсся да рэформы са спачуваннем і рабіў заявы на нелегальных прадаўцоў, але з-за плётак яўрэяў аб тым, што сведкаў таксама будуць кідаць у турму, ахладзеў да рэформы і стаў па-ранейшаму п’янстваваць у яўрэйскіх дамах» [16, арк. 46].

Сяляне з мястэчка Круглае Магілёўскага павета ў лісце да губернатара ў сакавіку 1906 г. прасілі захаваць мясцовую чайную, бо «пазбавіць нас чайной значыць пазбавіць духоўнай ежы і света і аддаць у яўрэйскія рукі… Зноў будзем шукаць прытулку ў яўрэйскіх прытонах, дзе нас будуць абдзіраць і падманваць» [10, с. 128]. Атрымліваецца, што сяляне ведаюць пра існаванне прытонаў, але не спяшаюцца заявіць аб іх урадавым органам, бо, нягледзячы на «падман і абдзіралаўку», збіраюцца наведваць іх у выпадку адсутнасці іншых месцаў правядзення вольнага часу.

Такім чынам, бачна, што незадаволенасць яўрэйскім насельніцтвам у плане пытання распаўсюджвання алкаголю датычылася як прадстаўнікоў дзяржаўных устаноў, так і мясцовай інтэлігенцыі і сялян. Такая сітуацыя ў пэўнай ступені спрыяла фарміраванню дзяржаўнага і побытавага антысемітызму. Аднак перабольшваць ролю яўрэяў у нелегальным гандлі нельга, бо дадзены пласт дакументаў у асноўным датычыцца гарадоў і мястэчак, дзе яны складалі значны працэнт насельніцтва, у той час як праблема датычылася і сельскай мясцовасці, а па-за межамі аселасці мела значна большы маштаб. Яшчэ за 10 год да ўвядзення манаполіі і стварэння папячыцельстваў

пісьменнік Мікалай Ляскоў напісаў наступныя радкі: «Нравы в Малороссии и в Белоруссии везде сравнительно много выше великорусских. Это общепризнанный факт, не опровергаемый никем и ничем, ни шаткими и сбивчивыми цифрами уголовной статистики, ни высоким и откровенным словом народной поэзии… Оказывается, что в великорусских губерниях, где евреи не живут, число судимых за пьянство, равно как и число преступлений, совершенных в пьяном виде, постоянно гораздо более, чем число таких же случаев в черте еврейской оседлости. То же самое представляют и цифры смертных случаев от опойства. Они в великороссийских губерниях чаше, чем за Днепром, Вилиею и Вислой. И так стало это не теперь, а точно так исстари было» [17].

Трэба асэнсаваць і матывы людзей, якія займаліся супрацьпраўнымі заняткамі. Яны хаваюцца не ў шматгадовым плане знішчэння іншай нацыянальнасці, а ў фінансавай выгадзе, бо нямала было сярод гандляроў і беларусаў. Калі былі ліквідаваны корчмы, старыя ўладальнікі, каб не пазбавіцца прыбыткаў і сродкаў да існавання, працягнулі сваю працу, але ўжо па-за законам, пры паблажлівых адносінах з боку суседзяў і бяздзейнасці дзяржаўных органаў. Вызначыць колькасць тых, для каго гэтая дзейнасць стала вяртаннем «у часы Саламона» і набыцця празмернага багацця, немагчыма. У якасці прыкладу адносін саміх таемных карчмароў да сваёй справы прывядзём словы селяніна-беларуса Паўлюка Л. з Магілёўшчыны: «А мне што? Хто ня хочыць, тэй ня йдзець, ня пьець, а я, балазе, на беднасць сваю зараблю… бывае іншы святы дзень і на паўрубельчыкі» [18, с. 4].

Такім чынам, вобраз яўрэйскага насельніцтва Беларусі, які паўстае на аснове дакументаў камітэтаў папячыцельства аб народнай цвярозасці, з'яўляецца супярэчлівым. Яўрэі як асобы, што ў большасці выпадкаў не злоўжываюць алкаголем, не разглядаліся камітэтамі як мэтавая аўдыторыя іх дзейнасці, і актыўнасці ў ажыццяўленні дзяржаўнага курсу па барацьбе з п'янствам не праяўлялі. З другога боку, яны вызначаюцца як асобы, што не прымалі дадзенага курсу і супрацьстаялі яму шляхам нелегальнага гандлю гарэлкай. Фарміраванне негатыўнага вобраза яўрэя-карчмара вяло да пашырэння антысеміцкіх настрояў, але простае насельніцтва ў большасці паблажліва ставілася да такой дзейнасці. Тэзіс аб спойванні яўрэямі Русі абвяргаецца не толькі тым, што гэтым займаліся прадстаўнікі розных нацыянальнасцей, але і дадзенымі з рэгіёнаў, дзе яўрэі стала не пражывалі.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. Сочинения Державина с объяснительными примечаниями Я. Грота. – СПб., 1872. – Т. 7. – 470 с.

2. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Фонд 2709. – Воп. 1. – Спр. 4.

3. Винные промыслы // Еврейская энциклопедия Брокгауза-Ефрона (1908–1913 гг.) [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://brockhaus-efron-jewish-encyclopedia.ru/beje/03-3/181.htm. – Дата доступа: 17.02.2012.

4. *А. І.* Слова аб праклятай гарэлцы і аб жыцці і смерці п'яніцы / А. І. – Пецярбург, 1900. – 9 с.

5. Отчёт Могилёвского попечительства о народной трезвости за 1899 год. – Могилёв, 1900. – 79 с.
6. НГАБ. – Фонд 3209. – Воп. 1. – Спр. 273.
7. НГАБ. – Фонд 2709. – Воп. 1. – Спр. 26.
8. НГАБ. – Фонд 2709. – Воп. 1. – Спр. 54.
9. НГАБ. – Фонд 2555. – Воп. 1. – Спр. 201.
10. *Мяньчэня, С. В.* Установы Магілёўскага павятовага папячыцельства аб народнай цвярозасці (1897–1914 гг.) / С. В. Мяньчэня // Гісторыя Магілёва: мінулае і сучаснасць: зб. навук. прац удзельнікаў IX Міжнар. навук. канф., 25–26 чэрв. 2015 г., г. Магілёў / уклад. А. М. Бацюкоў, І. А. Пушкін. – Магілёў: МДУХ, 2015. – 539 с.
11. НГАБ. – Фонд 132. – Воп. 1. – Спр. 18.
12. НГАБ. – Фонд 2555. – Воп. 1. – Спр. 9.
13. НГАБ. – Фонд 2709. – Воп. 1. – Спр. 35.
14. НГАБ. – Фонд 132. – Воп. 1. – Спр. 4.
15. НГАБ. – Фонд 132. – Воп. 1. – Спр. 1.
16. НГАБ. – Фонд 2296. – Воп. 1. – Спр. 2.
17. *Лесков, Н. С.* Еврей в России: несколько замечаний по еврейскому вопросу / Н. С. Лесков // Библиотека «Вехи». Русская религиозно-философская и художественная литература. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.vehi.net/asion/leskov.html#2. – Дата доступа: 18.02.2012.
18. Наша Ніва. – 1913. – № 6.

**(Дата подачи: 19.02.2016 г.)**

*У. Р. Рэут*
Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт, Мінск
*U. R. Reut*
The Belarus State Economic University, Minsk

**УДК 94(476)+94(470+571) “1818/1844”**

# ПАДРЫХТОЎКА ІНВЕНТАРНАЙ РЭФОРМЫ ПАМЕШЧЫЦКАЙ ВЁСКІ

# THE PREPARATION OF THE INVENTORY REFORM IN THE LANDLORD VILLAGE

*У артыкуле аналізуецца падрыхтоўка расійскім урадам інвентарнай рэформы памешчыцкай вёскі, рэалізацыя якой у выніку процідзеяння кансерватыўнай большасці Дзяржаўнага савета была абмежавана заходнімі губернямі Расійскай імперыі. Даецца ацэнка ўкладу міністраў Я. Ф. Канкрына, П. Д. Кісялёва і Л. А. Пяроўскага ў распрацоўку «Палажэння» 15 красавіка 1844 г. Зроблена выснова аб тым, што ўвядзенне абавязковых інвентароў разглядалася членамі ўрада як прамежкавы этап да ліквідацыі прыгоннага права.*

*Ключавыя словы: інвентарная рэформа; прыгонныя сяляне; «Палажэнне» 15 красавіка 1844 г.; Я. Ф. Канкрын; П. Д. Кісялёў; Л. А. Пяроўскі.*

*The article analyses the preparation of the landlord village inventory reform by the Russian government whose implementation was restricted to the western provinces of the Russian Empire as a result of the opposition by the State Council’s conservative majority. The article assesses Ministers J. Kankrin, P. Kiseliov and L. Perovsky’s contribution to the development of «Statute»*